*50-годдзю СССР прысвячаецца*

# ВЫНІКІ ПАДВЕДЗЕНЫ

Прафсаюзны камітэт і камітэт камсамола ГДУ правялі конкурс, прысвечаны 50-годдзю ўтварэння Саюза ССР, на лепшы фотаздымак і малюнак, зроблены студэнтамі. У журы паступіла звыш трыццаці работ, якія адлюстроўваюць розныя бакі студэнцкага жыцця, добрыя пейзажы роднага краю, мастацкія партрэты.

Вызначаны лепшыя фотаработы аматараў і мастакоў. Памятнымі падарункамі і прызамі журы адзначыла:

**Валянціна Прышчэпава,** студэнта чацвёртага курса механіка-матэматычнага факультэта, — за серыю здымкаў;

**Аляксандра Касалапава,** студэнта трэцяга курса гісторыка - філалагічнага факультэта, — за здымкі «На варту № 1», «Вочы», «Партрэт бацькі» і «Разліў».

**Віктара Сечку,** студэнта першага курса гісторыка-філалагічнага факультэта, — за мастацкія партрэты.

Граматамі прафкома і камітэта камсамола ўзнагароджаны:

**Віктар Байдун,** студэнт трэцяга курса геалагічнага факультэта, — за здымак «Фядзюха»;

**Леанід Гуліс,** студэнт чацвёртага курса геалагічнага факультэта,— за серыю пейзажаў;

**Віктар Цярэшчанка,** студэнт другога курса эканамічнага факультэта (завочнае аддзяленне) і **Міхаіл Кізеў,** студэнт чацвёртага курса механіка-матэматычнага факультэта, — за фотарэпартаж.

**М. БАЙДА.**





# УМЕННЕ БАЧЫЦЬ

Ідучы насустрач знамянальнай даце ў жыцці нашага народа — 50-годдзю з дня ўтварэння Саюза ССР, у мэтах папулярызацыі развіцця фота- і выяўленчага мастацтва ў нашым універсітэце праводзіўся конкурс на лепшы фотаздымак і малюнак.

Прaглядаючы фотаздымкі, што паступілі на конкурс, складваецца ўражанне, што аўтары імкнуцца адлюстраваць цікавыя куткі прыроды і толькі ў асноўным гэтым і абмяжоўваюцца. А са студэнцкага жыцця, якое вельмі цікава, работ, на жаль, вельмі мала. Аўтару ж у студэнцкім асяроддзі прадастаўлены вялікія, неабмежаваныя магчымасці пры фотаздымцы.

Возьмем, да прыкладу, фотаздымак «Сітуацыя» (работа Валянціна Прышчэпава, студэнта 4 курса мехмата). Ён не пазбаўлен жыццёвасці, цікава і жыва, з пачуццём гумару перададзена сцэнка ў адносінах двух маладых людзей. Кожны з нас калі не перажыў, дык сустрэне нешта падобнае сам. Або ўзяць здымак «Аднакурсніца». Ён падкупляе гледача выканаўчай манерай аўтара, таму што фотаздымак зроблен з вельмі блізкай адлегласці і патрабаваў асаблівай вастрыні і ўмення пры фотаздымцы.

Ёсць яшчэ на гэту тэму работа студэнта гісторыка-філалагічнага факультэта Аляксандра Касалапава. Называецца яна «Вочы». На думку членаў журы здымак выканан на дастаткова высокім тэхнічным узроўні, выкарыстаны, але далёка не цалкам, магчымасці данага тыпажу, таму што здымак зроблен пастановачна.

На мой погляд, названым аўтарам не хапае смеласці пры фотаздымцы, умення бачыць галоўнае ў патрэбны момант.

Аднадушна члены журы адзначылі работу «На варту № 1» (аўтар — А. Касалапаў). Мне даводзілася бачыць шмат работ розных аўтараў, і кожны з іх імкнуўся па-свойму адлюстраваць гэту тэму. Саша, бадай, проста, але ў той жа час даходліва, коратка перадаў настрой, адказнасць кожнага з салдат, што ідуць на варту да Маўзалея правадыра і заснавальніка нашай дзяржавы У. І. Леніна.

Асобна трэба пагаварыць і пра іншыя работы. Гэта серыя фотаздымкаў В. Прышчэпава. Сярод іх такія, як «Адны ва ўсім свеце», «Мы ідзем», «Раніца», «Эцюд» і «Перад навальніцай», заслугоўваюць увагі, каб пра іх расказаць. Калі апошнія тры носяць натуральны характар, то ў першых двух неабходна адзначыць аўтарскую індывідуальнасць пры падыходзе да вырашэння данай тэмы. Дзеці — гэта самая цяжкая для вопытнага прафесіянала тэма. Таму многія аматары неахвотна яе асвятляюць у сваіх работах. Але калі здымаюць, то часта бачыш мілыя, какетлівыя тварыкі, недзіцячую сур'ёзнасць. Радасна заўважыць, што ў рабоце «Мы ідзем», дзеці застаюцца дзецьмі. Яны бачаць фотаапарат Прышчэпава, але яго прысутнасць не адчуваецца імі, не прымушае іх прытварацца. А гэта вельмі важна, калі дзеці яму давяраюць.

Некалькі незвычайна глядзіцца здымак «Адны ва ўсім свеце!». Хочацца аддаць належнае аўтару ў тэхніцы выканання, таму што здымка вялася насупраць сонца, кампазіцыйнае рашэнне адпавядае задуме. Прыцягвае ігра святла, якая не перашкодзіла выдзеліць асноўнае.

Вельмі цікавая работа студэнта трэцяга курса геалагічнага факультэта Віктара Байдуна. Называецца яна «Фядзюха». Выдатна выкарыстана верхне-бакавое асвятленне, удала выбран пункт і момант здымкі, што надало абагульненне характару віхрастага хлапчука. Вось толькі з друкаваннем не зусім нармальна. Хацелася, каб у здымку прысутнічаў кантраст, тады хлапчук выглядаў бы больш рэзка, выпуклей. Павінен заўважыць, што аўтара больш за ўсё прыцягнула характарыстыка натуры, унутранае жыццё персанажу, а значыць — святло, кампазіцыя, стыль—тут не выпадковыя, а дакладна падпарадкаваны задуме.

Лёня Гуліс вучыцца на чацвёртым курсе геафака. Здымае многа і ўпарта. Яго можна ўбачыць з фотаапаратам у горадзе, у парку, а больш за ўсё ў лесе. У кожнага з фотааматараў ёсць жаданне, настойлівасць у дасягненні пастаўленай перад сабой мэты. Аднакурснікі, бачачы з якім цярпеннем і настойлівасцю адносіцца Лёня да здавалася б нічым не прывабнага сюжэту, гаворачы пры гэтым: «Дзівак, што там убачыў?!», потым самі з цікавасцю разглядаюць фотаздымак, наколькі ён лірычны і своеасаблівы па выкананню. Да такіх адносяцца яго работы «Хутка восень», «Браты», «Цуды прыроды», «У сонечны дзень», «Восень» (серыя) і іншыя. Пра яго творчасць варта сказаць словамі літоўскага мастака Чурленіса: «...жыць, шырока раскрыўшы вочы на ўсё цудоўнае, забыцца, адкуль і куды ідзеш, як цябе завуць, і глядзець вачыма дзіцяці».

Віктар Цярэшчанка (эканамічны факультэт) і Міхаіл Кізеў (механіка-матэматычны факультэт) прадаставілі сумесна некалькі работ. У гэтых рабят не хапае часам назіральнасці, хаця ў некаторых фотаздымках праяўляецца нешта сваё, але яно яшчэ не мае цвёрдай асновы. Хочацца верыць, што зразумеюць мяне правільна і ў далейшым мы ўбачым іх добрыя фотаработы.

У асноўным конкурс удаўся, хаця яго задачы і мэты выкананы не цалкам.

Журы пасля доўгіх спрэчак вырашыла адзначыць прызамі і граматамі Валянціна Прышчэпава і Аляксандра Касалапава, граматамі Віктара Байдуна, Леаніда Гуліса, Віктара Цярэшчанку і Міхаіла Кізева.

**А. РУДЧАНКА,**
**фотакарэспандэнт.**



# ЛЕПШАЯ Ў ВОБЛАСЦІ

Пярвічная арганізацыя ДТСААФ універсітэта прызнана лепшай у вобласці па абарона-масавай рабоце і ўзнагароджана абласным камітэтам ДТСААФ ваенна-тэхнічнай амуніцыяй.

25 снежня на сумесным пасяджэнні камітэта ЛКСМБ, прафкома і камітэта ДТСААФ падведзены вынікі сацыялістычнага спаборніцтва па абаронa-масавай рабоце ў факультэцкіх арганізацыях.

За разнастайную і дзейсную работу па ваенна-патрыятычнаму выхаванню першае месца прысуджана эканамічнаму факультэту, другое — факультэту фізічнага выхавання, трэцяе — механіка-матэматычнаму. Камсамольскія, прафсаюзныя і дтсаафаўскія арганізацыі гэтых факультэтаў узнагароджаны Ганаровымі граматамі камітэта ДТСААФ універсітэта. Наступныя месцы размеркаваны так: фізічны факультэт — чацвёртае, гісторыка-філалагічны — пятае, геалагічны — шостае, біёлага-глебавы — сёмае.

На біёлага-глебавым факультэце мала чыталася лекцый на ваенна-патрыятычную тэму, не было арганізавана сустрэч са знатнымі людзьмі, слаба праводзіцца работа па здачы норм ГПА, факультэцкая дтсаафаўская арганізацыя дрэнна выступае і на ваенна-патрыятычных відах спорту. Такое ж становішча і на геалагічным факультэце. У новым годзе гэтыя недахопы ім трэба выправіць.

**П. ЖУКАЎ,**
**старшыня камітэта ДТСААФ універсітэта.**

# ТРАПНАЯ ШАБЛЯ А. ДРАБЫШЭЎСКАГА

У Мінску праходзіла юнацкае першынство Беларускага савета студэнцкага таварыства «Буравеснік». Гэтыя спаборніцтвы з'яўляліся адным з галоўных этапаў адбору і камплектавання зборнай каманды БССР для ўдзелу ва ўсесаюзным чэмпіянаце.

Гомельскі дзяржаўны універсітэт быў прадстаўлен на спаборніцтвах кандыдатамі ў майстры спорту А. Драбышэўскім (эканамічны факультэт) і Г. Шаўровым (факультэт фізічнага выхавання) і першаразраднікам С. Шэметам (геалагічны факультэт).

Паспяхова выступіў А. Драбышэўскі. Ён атрымаў перамогі ва ўсіх паядынках і стаў мацнейшым шаблістам сярод юнакоў. Пятае месца ў гэтым відзе зброі заняў Г. Шаўроў.

З паражэння пачаў спаборніцтвы на рапірах С. Шэмет, але наступныя баі гамяльчанін закончыў у сваю карысць. Такі ж вынік меў яшчэ адзін спартсмен — В. Скавароднікаў. Для выяўлення чэмпіёна паміж імі быў праведзен дадатковы бой. З мінімальнай перавагай (5:4) выйграў Скавароднікаў. С. Шэмет стаў другім прызёрам.

Па выніках турніру сфарміравана зборная каманда Белсавета СДСТ «Буравеснік». У яе састаў уключаны А. Драбышэўскі, С. Шэмет і Г. Шаўроў.

**В. ЛІСОЎСКІ,**
**майстар спорту, старшы выкладчык факультэта фізічнага выхавання, трэнер па фехтаванню.**

**В. а. рэдактара Ул. БАЛОГА.**

АЗ 35658. «Гомельский университет»—орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ, профкома и месткома Гомельского государственного университета (на белорусском языке). Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Заказ 7694.